## АБ ВЫЗНАЧЭННІ ПАНЯЦЦЯ «НАВУКОВАЯ ШКОЛА» Ў КАНТЭКСЦЕ ГУМАНІТАРНАЙ НАВУКІ

***Гулак А. А.***
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

*The article deals with the concept «scientific school»: its contents is exposed in the context of theory and methodology of humanitarian sciences. The author analyzes the chronology of scientific schools, their historical forms, the types of communication within them. The materials are useful to increase effectiveness of teaching socio-humanitarian courses in the system of higher education.*

Развіццё гуманітарнай навукі адбываецца ва ўмовах паліфаніі плыняў, кірункаў і школ, што яе складаюць. Гісторыя навукі – «гэта не толькі гісторыя тых ці іншых фактычных здабыткаў і ад-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

крыццяў, але і гісторыя ідэй, гісторыя метадалагічных пошукаў» [1, с. 239]. Для эфектыўнага выкладання сацыягуманітарных дысцыплін у сістэме ВНУ актуальнай праблемай з'яўляецца вывучэнне школ у навуцы, ацэнка і засваенне іх тэарэтычнай спадчыны.

Праблема тэарэтычнага асэнсавання паняцця «навуковая школа» паўстала ў савецкім навуказнаўстве яшчэ ў 1960–1970-я гг. У 1980–1990-х гг. убачылі свет даследаванні па навуковых школах у прыродазнаўчых навуках, эканоміцы, сацыялогіі і іншых галінах ведаў. Аднак пры значнай колькасці публікацый трэба адзначыць, што навуказнаўчы аналіз, зроблены на гістарыяграфічным матэрыяле прыродазнаўчых навук, толькі часткова прымянімы да школ у гуманітарыстыцы. Даследчыкі не далі адказаў на цэлы шэраг пытанняў: што наогул аб'ядноўвае паняцце «навуковая школа» ў гуманітарнай навуцы? якія яе вызначальныя характарыстыкі і спецыфіка? наколькі значны ўплыў на яе сацыяльных фактараў? Нарэшце, можна паставіць пытанне і аб навуказнаўчым вызначэнні паняццяў «кірунак у навуцы», «навуковая плынь», «навуковая тэорыя». Гэтыя паняцці дасюль з'яўляюцца тэарэтычна не вызначанымі, «ужываюцца часта як сінонімы, якія ўмоўна абазначаюць шэраг ці групу паслядоўнікаў, чые працы заснаваны на агульнай для іх філасофскай, эстэтычнай, сацыялагічнай, культуралагічнай і іншай навуковай канцэпцыі, падобныя па праблематыцы і метадалогіі, хаця і адрозніваюцца тэматыкай і канкрэтнымі вывадамі па той ці іншай праблеме» [2, с. 161].

Усебаковы навуказнаўчы аналіз дэфініцый навуковай школы правёў В. Гасілаў, які класіфікаваў школы па ступені ўкладу ў агульназначны фонд навуковых ведаў. Так, «авангардная», «канкуруючая» прызнаюцца ім уласна школамі. Яшчэ тры тыпы («аўтаркічная», «кампрадорская» і «эпігонская») аўтар вызначае з шэрагам агаворак [3, с. 133]. Паводле ўнутранай камунікацыі яе прадстаўнікоў навуковыя школы ў гуманітарыстыцы неаднародныя. Г. Лайтко вылучае чатыры тыпы: 1) навуковыя школы са структурай, арыентаванай на цэнтр, і кантактнай камунікацыяй; 2) навуковыя школы са структурай, арыентаванай на цэнтр, і апасродкаванай камунікацыяй; 3) навуковыя школы, пазбаўленыя цэнтра, але з кантактнай камунікацыяй. 4) «навуковыя школы, якія пазбаўлены цэнтра і валодаюць апасродкаванай камунікацыяй. У гэтым выпадку асноўная ідэя фарміруецца і рэалізуецца ў розных месцах незалежна і адносна адначасова; агульнасць навуковай школы пазнаецца толькі праз літаратуру» [4, с. 235].

Часам узнікнення школ як з'явы, характэрнай для развіцця навукі, некаторыя даследчыкі прызнаюць канец XVIII ст. – пачатак XIX ст. [5, с. 166]. Наогул гістарычная варыятыўнасць навуковых школ часта абсалютызуецца: «паняцце навуковай школы <...> трактуецца па-рознаму для розных гістарычных перыядаў» [6, с. 197]. С. Хайтун развівае ідэю «этапнага» развіцця навуковай школы, вылучаючы перыядызацыю развіцця школ-калектываў у выглядзе трох этапаў. Для этапа «класічнай школы» (з другой палавіны XIX ст.) характэрна індывідуальная навуковая творчасць яе прадстаўнікоў, сувязь з універсітэцкай навукай. «Класічную школу» змяняюць больш дынамічныя і кароткачасовыя «дысцыплінарная школа» (з пачатку XX ст.) і «праблемная школа» (прыблізна з 1960 – 1970-х гг.) [7, с. 277–279].

Неабходна адзначыць, што супольнасці вучоных у той ці іншай галіне не з'яўляюцца аднароднымі і аднатыпнымі па характару сувязей між яго членамі і па характару пераемнасці ідэй. Гэта адлюстроўваецца, напрыклад, у прынятых у навуцы назвах школ, што падкрэсліваюць іх «мікрасацыяльную структуру, якая ўяўляе сабой своеасаблівае непаўторнае адзінства» [8, с. 8]. Напрыклад, у даследаванні С. Токарава «Гісторыя замежнай этнаграфіі» (1973) назвы навуковых школ у антрапалогіі і этналогіі даюцца і паводле прынцыпу лакалізацыі навуковай дзейнасці яе прадстаўнікоў (шырэй – па нацыянальнаму прынцыпу), і па імені заснавальніка школы, і па назве навуковай тэорыі. Але часцей у назвах фіксуецца камбінацыя гэтых прынцыпаў: школа англійскага дыфузіянізма

У. Рыверса, амерыканская школа Ф. Бааса, дацкая школа, антрапагеаграфічная школа Ф. Ратцэля, французская сацыялагічная школа Дзюркгейма, псіхааналітычная школа З. Фрэйда, этнапсіхалагічная школа А. Кардзінера ды інш. За некаторымі школамі ў славянскай фалькларыстыцы ўстойліва замацаваліся назвы па імені іх заснавальнікаў – «школы А.М. Весялоўскага, У.Ф. Мілера, М.Я. Мара, Ф. Калесы, К.В. Квіткі, М. Драгаманава, Б.У. Асаф'ева, Р.Р. Шырмы» [2. с. 161].

Распрацаванымі з'яўляюцца крытэрыі паняцця «навуковая школа», вылучаныя С. Міхальчанкам. Школаўтваральнымі крытэрыямі аўтар лічыць: па-першае, фармалізаваныя адносіны заснавальніка школы і яго вучняў, выражаныя ў педагагічнай камунікацыі, па-другое, агульныя метады і прынцыпы апрацоўкі першакрыніц, па-трэцяе, метадалагічную (тэарэтычную, філасофскую) агульнасць, па-чацвёртае, супадзенне ці блізкасць канкрэтна-гістарычных палажэнняў і тэматыкі даследаванняў [5, с. 4–5]. Адзначым, што даследаванне С. Міхальчанкі прысвечана тром пакаленням гісторыкаў, якія ў 1860–1910-х гг. працавалі ў кіеўскім Універсітэце Святога Уладзіміра. Гэта прадстаўнікі так званай кафедральнай навукі, таму, кажучы словамі аўтара, іх адносіны насілі «фармалізаваны характар». Аднак у першай палавіне і сярэдзіне XIX ст. нарадазнаўчая навука толькі пачынала складвацца як навука універсітэцкая. У яе станаўленні, як піша Г. Лайтко, «вызначальнымі з'яўляліся безасабовыя формы сацыяльнай камунікацыі» [4, с. 230]. Адна з высноў, да якой прыходзіць даследчык рускай гістарычнай школы Г. Мягкоў, заключаецца ў тым, што школы ў гуманітарнай навуцы «разглядаюцца як больш рухомыя, гнуткія, хаця і не аморфныя. Гэтым школы ў гістарычнай навуцы і ў гуманітарных навуках наогул адрозніваюцца ад больш кампактных і ўнутрана спаяных школ у прыродазнаўстве» [9, с. 23]. Указанае адрозненне мае метадалагічнае тлумачэнне, звязанае з тым, што школа ў гуманітарнай навуцы «структуруецца па ўзору, па «матрыцы» самой гэтай навукі, для якой характэрны індывідуалізуючы метад пазнання. Індывідуалізм прадмета спараджае індывідуалізм метаду і індывідуалізм пазнаваўчай дзейнасці» [9, с. 23].

Нельга не пагадзіцца з меркаваннем А. Тапаркова, што навуковыя школы ў XIX ст. «існавалі хутчэй у форме нейкіх сукупнасцей ідэй» [10, с. 15], а не ў вызначаных арганізацыйна-структурных формах. Такім чынам, можна адзначыць, што ў навуковай школе сярэдзіны XIX ст. назіраюцца толькі элементы характарыстык, уласцівых сучасным навуковым школам. «Цяжка знайсці структуру, – піша А. Баеў, – якая б у поўнай меры валодала ўсімі прыкметамі навуковай школы: адзінствам праблематыкі, метадаў даследавання і вытлумачэння навуковых вынікаў, і да таго ж была б звязана з пэўнай асобай і геаграфічнай кропкай» [11, с. 503].

Асобна трэба спыніцца на этапе распаду навуковай школы. Логіка развіцця навукі, якая абумоўлівае развіццё даследчыцкай думкі ў канкрэтным праблемным полі, паступова прыводзіць да дэактуалізацыі ідэй школы і страты школай былога ўплыву ў навуцы. Этапы распаду навуковай школы характарызуюцца менш дакладнай храналагічнай вызначанасцю, могуць накладацца адзін на адзін.

Крытэрыі, прымянімыя для вызначэння паняцця «навуковая школа» XIX ст., на нашу думку, могуць быць размеркаваны па ступені значнасці.

Першым крытэрыем з'яўляецца, выкарыстоўваючы тэрміналогію М. Ярашэўскага, «агульная інтэлектуальная (тэарэтычная і метадычная) платформа» [8, с. 42]. Другім крытэрыем можна назваць навізну і значнасць навуковых і практычных вынікаў дзейнасці прадстаўнікоў навуковай школы. Трэцім крытэрыем можна лічыць дасягненне пераемнасці ў працэсе навуковага пазнання і «забеспячэнне прыросту навуковых ведаў» [12, с. 252], якое адбылося ў выніку засваення прац прадстаўнікоў навуковай школы.

Такім чынам, паняцце «навуковая школа» ў дачыненні да гуманітарыстыкі XIX ст. неабходна трактаваць як *неінстытуалізаваная супольнасць вучоных – прыхільнікаў пэўнай тэорыі і метадалагічных падыходаў, працы якіх характарызуюцца навізной і значнасцю пастаўленых праблем, навуковых высноў і практычных вынікаў.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Літаратура**


1. Гусев, В. Е. Об изучении истории русской фольклористики / В.Е. Гусев. Известия Академии наук СССР. Отделение литературы и языка, 1956. – Том XV. Вып. 3. – С. 239–249.
2. Восточнославянский фольклор: Слов. науч и нар. терминологии / редкол.: К. П. Кабашников [и др.] – Минск: Навука і тэхніка, 1993. – 478 с.
3. Гасилов, В.Б. Научная школа – феномен и исследовательская программа науковедения / В.Б. Гасилов // Школы в науке / Под ред. С.Р. Микулинского [и др.]. – М.: Наука, 1977. – С. 119–153.
4. Лайтко, Г. Научная школа – теоретические и практические аспекты / Г. Лайтко // Школы в науке / Под ред. С.Р. Микулинского [и др.]. – М.: Наука, 1977. – С. 217–148.
5. Михальченко, С.И. Киевская школа в российской историографии (середина XIX– первая треть XX в.) / С. И. Михальченко // Автореф. дис. на соиск. учен. степ. д-ра ист. наук: 07.00.09 / Моск. пед. гос. ун–т им. В.И. Ленина. – М.: 1998. – 32 с.
6. Старостин, Б.А. Из истории международных контактов / Б. А. Старостин // Школы в науке / Под ред. С.Р. Микулинского [и др.]. – М. : Наука, 1977. – С. 196–217.
7. Хайтун, С.Д. Об историческом развитии понятия научной школы / С.Д. Хайтун // Школы в науке / Под ред. С.Р. Микулинского [и др.]. – М.: Наука, 1977. – С. 275–286.
8. Ярошевский, М.Г. Логика развития науки и научная школа / М.Г. Ярошевский // Школы в науке / Под ред. С. Р. Микулинского [и др.]. – М.: Наука, 1977. – С. 7–97.
9. Мягков, Г.П. »Русская историческая школа»: теория и история развития школы как научного сообщества / Г. П. Мягков // Автореф. дис. на соиск. учен. степ. д-ра ист. наук: 07.00.09. – Казань, 2000. – 43 с.
10. Топорков, А.Л. Теория мифа в русской филологической науке XIX века / А. Л. Топорков. – Рос. акад. наук, Ин-т мировой лит. им. А.М.Горького. – М.: Индрик, 1997. – 455 с.
11. Баев, А.А. О научных школах / А.А. Баев // Школы в науке / Под ред. С. Р. Микулинского [и др.]. – М.: Наука, 1977. – С. 503–504.
12. Огурцов, А.П. Научная школа как форма кооперации ученых / А.П. Огурцов // Школы в науке / Под ред. С.Р. Микулинского [и др.]. – М.: Наука, 1977. – С. 248–262.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ